В. выконваюць розныя творы («маршы»), за што апошнія плацяць грошы, якія потым перадаюцца маладым. Заканчвалася В. *пярэзвамі.* Многія рытуальныя дзеі В. сёння пераасэнсаваны, ператвораны ў забаву, ігру, напр., «выкуп нявесты», праверка цнатлівасці маладой, пасад на дзяжу, пасаг, плач нявесты перад ад'ездам у дом мужа, рытуальныя дзеянні з выпечкай каравая і інш. У той жа час у сучасным В. працягваюць існаванне лепшыя абрады і звычаі, якія адпавядаюць сучасным культ. патрабаванням грамадства.

*Літ.*: Веселле: абрад. Мінск, 1978; Сысоў У.М. З крыніц спрадвечных. Мінск, 1997. *А.М.Аляхновіч.*

**ВЯСЕ́ЛЬНЫЯ АБРАДАВЫЯ СТРА́ВЫ**. Ужываліся на працягу *Вяселля*. Традыц. абавязковымі В.а.с. былі яечня (самая пашыраная), варанае або смажанае мяса, каша, сыр, мёд, пірагі і рознае печыва. Маладыя елі яечню адной лыжкай («каб і ў далейшым жыцці ў іх усё дзялілася папалам»), пасля вянца, а таксама перад першай шлюбнай ноччу (лічылася, што яна павялічвае сілу і забяспечвае маладым дзетароднасць). Калі маладая захавала цнатлівасць да шлюбу, свякроў частавала маладых і гасцей нявесты яечняй-баўтухай, упрыгожанай выпечанымі з цеста кветкамі і птушкамі; калі «не», падавала накалупаную яечню або бліны з выразанымі пасярэдзіне дзіркамі. Мяса спажывалася на працягу ўсяго вяселля. Найб. сакральны статус мела курынае мяса, таму што ў нар. уяўленнях курыца з'яўлялася сімвалам сям'і і замужняй жанчыны, носьбітам мацярынскага пачатку. У Магілёўскай губ. смажаніна з птушкі была завяршальнай стравай на застоллі, пасля якой малады выводзіў маладую з-за стала і адводзіў у свой двор. У паўд.-ўсх. рэгіёнах Беларусі ў склад В.а.с. уваходзілі курнікі — круглыя пірагі, начыненыя курыным мясам, ці пірог, пасярэдзіне якога была замешчана курыная галава з цеста. Каша сімвалізавала дабрабыт і заможнасць. Яе падавалі ўпрыгожанай каснікамі з кветкай, што азначала маральную чысціню маладой. На Віцебшчыне кашай сустракалі маладых у доме маладога. Сыр звязваўся са зменай сямейна-ўзроставага статусу дзяўчыны, служыў сімвалам цнатлівасці. На Гродзеншчыне маладая пасля дасягнутай дамоўленасці давала маладому сыр — «злюблёнік», які прызначаўся на пачастунак бацькам і сваякам маладога. У сваю чаргу маці жаніха напярэдадні вяселля адпраўляла са сватам у дом маладой сыр для яе сябровак, які лічыўся сімвалічным выкупам за маладую. Мёд быў адной з найб. архаічных сакральных страў. Яго разам з яечняй і сырам давалі маладым перад або пасля шлюбнай ночы. У Барысаўскім павеце ў доме жаніха маладых частавалі лустай хлеба з мёдам, каб іх жыццё было «салодкім» і заможным. Вял. абрадавае значэнне меў вясельны хлеб — пірагі, якія выпякаліся з каравайнага цеста або гатаваліся асобна, печыва — баранкі, драмушкі, шышачкі, каравайчыкі і інш. Хлеб на веселлі сімвалізаваў жыццё, багацце, дабрабыт. Ён і яго абрадавыя заменнікі — зерне, каша, бліны, дзяжа — з'яўляліся кампанентамі ўсіх вясельных рытуалаў. У сваты і на *заручыны* ідуць з хлебам і гарэлкай; маладая ў знак згоды насыпае жыта ў бутэльку свата або замест іх хлеба дае свой. Бласлаўлялі таксама з хлебам: перад вянцом маладую або маладога садзілі на дзяжу з хлебам у руках; сустракаючы пасля шлюбу і адпраўляючы ў дом жаніха, маладых абсыпалі зернем.

*Літ.*: Никольский Н.М. Происхождение и история белорусской свадебной обрядности. М., 1956; Веселле: абрад. Мінск, 1978; Веселле: песні. Т. 1—6. Мінск, 1980—88; Сумцов Н.Ф. Символика славянских обрядов. М., 1996.

*Т.К.Цяпкова.*

**ВЯСЕ́ЛЬНЫЯ ГУ́ЛЬНІ**, тэатралізаваныя жартоўныя прадстаўленні ў падрыхтоўчы, уласна вясельны і паслявясельны перыяды. Вылучэнне В.г. у асобны вясельны жанр адбылося шляхам трансфармацыі асобнай традыцыі, звычая, якія згубілі пэўныя санкцыяніраваныя асаблівасці. Сярод традыц. В.г. «выкуп маладой», «выкраданне нявесты», «пазнай нявесту», «брат прадае сястру», «расплятанне касы», «выпрабаванні маладых» і інш. Многія гульні маюць рэгіянальнае бытаванне. Своеасаблівае гульнёва-жартоўнае прадстаўленне ўяўляе момант архаічнага сватання (заручын), калі госці, што прыехалі да маладой, прама не пытаюцца аб згодзе на шлюб у бацькоў, а «падыходзяць» здалёку: «Мы — людзі з далёкага краю, дарогаю прытаміліся, ці не пусціце, людзі добрыя, переначаваць», «А ці не маеце цялушку на продаж?» або «Наш бык да вашай цялушкі прывык», ці «У нас ёсць купец, у вас — тавар», «Наш хлеб — ваша вадзіца, наш хлопец — ваша дзявіца, наш хлопец не ўмее лапці плесці, ваша дзявіца не ўмее хату месці, трэба іх да кучы звесці» і інш. У дыялогах нібы выпадкова заблукаўшых гасцей праяўляюцца стараж. дахрысціянскія формы шлюбу — умыкання (украдання) і куплі-продажу нявесты. Цікавым з'яўляецца вясельны звычай «перанімання перапою», або наладжвання «рагаткі» вясельнай працэсіі, калі сваты маладых павінны былі аддаць выкуп (падарунак) за праезд па дарозе. Да паслявясельнага перыяду адносіцца гульня «Цыганы», калі вясельнікі пераапранаюцца ў вясёлых «цыганаў» («яўрэяў», «венграў», «салдат», доктараў») і ідуць па дарозе ці ў хаты, спяваючы, варожачы, выраблячы інш. прыдумкі. Забаўнымі выглядалі сцэны жартоўнага вяселля падстаўных «маладых», дзе праводзіліся маль усе этапы вясельнага абраду. З цягам часу асобныя гульнявыя абрады зніклі з ужытку (архаічныя традыцыі праверкі цнатлівасці маладой, саромныя песні і гульнёва-абразлівыя абрады, звязаныя з першай шлюбнай ноччу — «пакладзіны», «камора», «клецъ»).

*Літ.*: Веселле: абрад. Мінск, 1978; Палескае веселле. Мінск, 1984; Гульні, забавы, ігрышчы. 3 выд. Мінск, 2003; Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. 2 выд. Мінск, 2007. *А.Ю.Лозка.*

**ВЯСЕ́ЛЬНЫЯ ПЕ́СНІ**, сістэма песень, якія суправаджаюць вясельны абрад. В.п. звязаны са слоўнымі формуламі, пажаданнямі, вітаннямі, благаславеннямі, якія ўтвараюць нар. маральна-этычны кодэкс. Песня і слова, музыка, танцы, дыялогі, замовы, рацэі і інш. арганічна ўваходзяць у драм.-харэагр. формы, суправаджа-

юць кожны рух вяселля, эмацыянальна ўздзейнічаюць на кожнага прысутнага. Шлюб у В.п. малюецца супярэчліва: дзяўчына імкнецца знайсці сваё каханне і шчасце, але ў той жа час успрымае шлюб як трагедыю развітання з дзявочым раем, бесклапотным жыццём і пераходам у невядомы свет чужых людзей («А там вулачкі невядомыя, // блудзіць жа я буду. // А там суседкі незнаёмыя // судзіць мяне будуць. // Аддалі мяне, забылі мяне, // як жа вам не жаль будзе?»). Многія В.п. ўтрымліваюць трагічныя вобразы-сімвалы: сваты «як каршуны», што прыляцелі за «шэрай вутачкай», жаніх «люты сокал», які «вутачку прыклюе, у чужую старану панясе». Спецыфіка выканання В.п. заключалася ва ўзаемадзеяннях 2 вясельных хораў: з роду маладой і роду жаніха. Яны спявалі як ва ўнісон, так і па чарзе (антыфон). Спявалі і жаночыя хоры, што прадстаўлялі маладога і маладую і складаліся з выканаўцаў з боку замужніх жанчын і дзяўчат.

В.п. падзяляюцца на дакладныя тэматычныя групы. А п а в я д а л ь н ы я  п е с н і каменціруюць змест абрадавай дзеі, паказваюць адносіны да яе роду (хору), дакументальна зацвярджаюць шлюб маладых людзей, апавядаюць пра тое, што і як яны абавязаны выконваць («Запіта Марынка, запіта, // шоўкам хустанька нашыта. // Запіваў яе ўвесь род, // а яе баценька найперш»). Імператыўныя песні вызначаюцца загадам, наказам, парадай, нагадваюць кожнаму пра яго абавязкі на вяселлі («Крыкнуў Іванька па двару: // — Сабірайцеся, сваточкі, на вайну, // будзем ваенку ваяваць, // будзем сабе дзевачак выбіраць»). З а к л і н а л ь н ы я  п е с н і прасякнуты магіяй, для іх характэрны заклёны-заклікі, звароты да з'яў прыроды, язычніцкіх багоў, хрысціянскіх бога і святых, просьбы да роду, бацькоў і інш. аб шчаслівым шлюбе, лёсе, долі маладых («Ой, сваточкі-галубочкі, просім вас, // каб не стала наша дачушка ў абідзе, // каб не была ёй паветачка за хатку, // каб не была ёй суседачка за матку»). В е л і ч а л ь н ы я  п е с н і скіраваны на «ўпрыгожанне», «узвелічэнне» гал. персанажаў вяселля, у першую чаргу маладой і маладога, іх бацькоў («Ай, вумная-разумная Матрунка! // Паставіла старожыньку на браду, // сама села пад вішанькай у саду»). Ж а р т о ў н а - с а т ы р ы ч н ы я  п е с н і прыўносяць дух гумару, камізму і сатыры, выяўляючы адмоўныя рысы характару, знешняга выгляду персанажаў вяселля, асабліва дружак, свата, сваццi і інш. («Ды ўвайшлі ў хату тры сваткі, // ды ніводнага людского няма: // у аднаго — крывая нага, // у другога — сіва барада, // а ў трэцяга — лыса галава»). Э л е г і ч н ы я  п е с н і раскрываюць патаемныя думкі і перажыванні маладых, пераважна нявесты, яе родных і сваякоў. Яны паказваюць адносіны ўдзельнікаў вяселля да абрадавых дзей, іх унутраны свет, тое, што схавана ад знешняга ўспрыняцця і з'яўляецца кантрастным да агульнай весялосці («Ай, вязуць міне барамі, // а як цёмны бор, цёмны бор, // каб ня відзела таткін двор, // як мая мамачка печ топіць, // як мой татачка дровы коліць»). Прыпеўкі да танцаў у час вяселля носяць пераважна эратычны характар. Іх танчаць як паасобку, так і злучаючыся ў пары, са скокамі, паваротамі, жэстамі, мімікай і інш. Першапачаткова з'яўляючыся своеасаблівым сцэнарыем рытуальных дзей вяселля, маючы юрыд., магічную, практычную функцыі, В.п. сёння ўсё больш выконваюць эстэтычную функцыю.

*Літ.*: Лірыка беларускага вяселля. Мінск, 1979; Вяселле: песні. Кн. 1—6. Мінск, 1980—88; С ы с о ў У.М. З крыніц спрадвечных. Мінск, 1997.

*А.М.Аляхновіч.*

**ВЯСЕ́ЛЬНЫЯ ТА́НЦЫ**, абрадавыя скокі, якія выконвалі ўдзельнікі *Вяселля* на пэўных яго этапах. *Агледзіны*, *заручыны*, дзявочая субота, выпяканне каравая, выезд жаніха з дружкамі за нявестай, вясельны стол і пасад нявесты на дзяжу, звядзенне маладых суправаджаліся шматлікімі адмысловымі песнямі і танцамі, дзе кожны эпізод уяўляў скончаны невялікі муз.-драм. спектакль. У Беларусі мала спец., завершаных танц. форм, якія маюць дачыненне толькі да вясельнага абраду. Асобным танц. выхадам жаніха і нявесты пачынаўся танец *паланез*, у якім быў закладзены сэнс сустрэчы двух родаў. За маладымі ў 2 шарэнгі парамі станавіліся госці з боку жаніха і нявесты. Моцна прытупваючы, яны то сыходзіліся, то разыходзіліся. Да вяселля былі прымеркаваны і танцы, якія сімвалізавалі жыццёвы шлях будучай сям'і, напр., карагоды «Зазулейка», «Зязюля» аб жаночым суме, яе нялёгкай долі і інш. Танец «Заяц» сімвалізаваў мужчынскую пладавітую сілу, «Каза» быў прысвечаны любоўна-шлюбнай тэматыцы, меў імправізацыйны характар. У некаторых мясцовасцях існаваў звычай скакаць па сталах і лаўках пасля таго, як на маладую надзелі намітку. Спяваючы «Мой каравай вышэй за ўсіх!», іншы раз на стале танцавала каравайніца. Ад'язджаючы дадому з вяселля, госці імкнуліся на шчасце што-небудзь зламаць, таму танчылі на лаўках і сталах. Абавязковымі былі карагод-абвод ці абыход, у час якога з караваем і ручнікамі — знакам дабрабыту, дастатку і сямейнага шчасця — абыходзілі маладых, стол, хату. Аднак такія карагоды і скокі не мелі строга вызначаных рухаў і малюнкаў, імправізаваліся і прыстасоўваліся да мелодыі песні або найгрышу.

*А.У.Рыбчынская.*

**ВЯСЕ́Я**, вёска ў Слуцкім р-не, на р. Вясейка. За 8 км на ПнУ ад горада і чыг. ст. Слуцк на лініі Мінск—Слуцк, 111 км ад Мінска, на шашы Слуцк—Старыя Дарогі. Цэнтр Вясейскага с/с. 511 гаспадарак, 1275 ж. (2011).

Вядома з 15 ст. як сяло ў Слуцкім княстве ў складзе ВКЛ. З 1507 у Навагрудскім, з 1791 у Случарэцкім паветах. Пасля 2-га падзелу Рэчы Паспалітай (1793) у складзе Рас. імперыі, у Слуцкім павеце Мінскай губ. У 1905 вёска, 83 двары, 645 ж., школа, капліца, млын. З 20.8.1924 у Прошчыцкім с/с Слуцкага р-на Слуцкай, з 9.6.1927 Бабруйскай (да 26.7.1930) акруг. З 20.2.1938 у Мінскай вобл. З 1939 цэнтр сельсавета. У Вял. Айч. вайну з канца чэрв. 1941 да пачатку ліп. 1944 В. акупіравана ням.-фаш. захопнікамі. З 20.9.1944 у Бабруйскай, з 8.1.1954 зноў у Мінскай абласцях. У 1998 — 486 гаспадарак, 1500 ж.